# "Якаснае забеспячэнне адукацыйнага працэсу і выхаванне моладзі — *прыярытэты нашай працы*"



*Інтэрв'ю галоўнага рэдактара "Беларускага гістарычнага часопіса" Аляксандра КОРЗЮКА з доктарам гістарычных навук, прафесарам кафедры псіхалогіі Веньямінам КОСМАЧАМ, у 2001—2009, 2016—2020 гг. — дэканам гістарычнага факультэта ВДУ імя П.М.Машэрава*




Настаўніцкі інстытут. Віцебск, 1910 г.



Уладзімір Перцаў.



Аляксей Сапуноў.

— Паважаны Веньямін Аркадзьевіч! Раскажыце, калі ласка, пра асноўныя вехі развіцця вышэйшай гістарычнай адукацыі ў Віцебску.

— Гісторыя вышэйшай гістарычнай адукацыі ў Віцебску пачынаецца з 1 кастрычніка 1918 г., калі настаўніцкі інстытут, заснаваны ў 1910 г., быў пераўтвораны ў вышэйшую навучальную ўстанову, першую падобнага тыпу ў Беларусі, — Віцебскі педагагічны інстытут. Арганізацыйна ён складаўся з трох цыклаў: славесна-гістарычнага (105 чалавек), прыродазнаўча-геаграфічнага (95 чалавек) і фізіка-матэматычнага (87 чалавек).

У 1919 г. усе пединстытуты былі рэфармаваныя ў інстытуты народнай адукацыі (ІНА). У складзе трэцяга аддзела Віцебскага ІНА з 1919 г. з'явіліся чатыры факультэты, у іх ліку — сацыяльна-гістарычны. Першымі дэканамі сацыяльна-гістарычнага факультэта былі К.Ф.Гаховіч (1921—1923 гг.) і С.А.Ляскоўскі (1923—1924 гг.). Такім чынам, гістфак і віцебская гістарычная школа бяруць свой пачатак з 1919 г. У 2019 г. яму споўнілася 100 гадоў.

У 1921/1922 навучальным годзе Віцебскі ІНА пераўтвараецца ў Віцебскі практычны інстытут народнай адукацыі (ВПІНА), сацыяльна-гістарычны факультэт налічваў 87 студэнтаў. У 1922 г. 6 з 18 прафесараў ВПІНА працавалі на сацыяльна-гістарычным факультэце.


Віталь Сербента.


Грыгорый Трухноў.


Леў Шнеерсон.

Сярод іх доктар гістарычных навук, прафесар П.М.Ардашаў, які чытаў лекцыі і праводзіў семінарскія заняткі па новай і навейшай гісторыі. Тут жа працавалі У.М.Перцаў, А.П.Сапуноў, М.М.Бахцін і іншыя. У маі 1924 г. ВПІНА пераўтвараецца ў Віцебскі вышэйшы педагагічны інстытут (ВВПІ) з захаваннем сацыяльна-гістарычнага, фізіка-матэматычнага і біёлага-хімічнага факультэтаў (усяго 430 студэнтаў). У тым жа годзе было прынята рашэнне аб пераводзе студэнтаў і выкладання Віцебскага ВПІ ў Белдзяржуніверсітэт у сувязі з недахопам бюджэтных сродкаў.

У 1930 г. на ранейшай матэрыяльнай базе быў адноўлены Віцебскі індустрыяльна-педагагічны інстытут (ВІПІ), з 1933 г. пераўтвораны ў Віцебскі дзяржаўны педагагічны інстытут (ВДПІ), у снежні 1934 г. установе было прысвоена імя С.М.Кірава. У яго складзе зноў запрацаваў гістарычны факультэт. За 11 гадоў (з 1930 па 1941 г.) Віцебскі пединстытут выпусціў 1362 спецыялісты.

У 1941 г. усё перапыніла Вялікая Айчынная вайна. Загадчык кафедры ўсеагульнай гісторыі, кандыдат гістарычных навук П.А.Старазубец яшчэ ў 1940 г. быў прызваны ў Чырвоную армію, а з 1941 г. на фронт пайшлі многія выкладчыкі і студэнты. Выпускнік гістфака, настаўнік гісторыі К.А.Абазоўскі, стаў лётчыкам і да канца лета 1944 г. здзейсніў больш за 106 баявых вылетаў. Ён загінуў у кастрычніку 1944 г. у паветраным баі, пасмяротна ўганараваны званнем Героя Савецкага Саюза.

Пасля вызвалення горада Віцебскі пединстытут імя С.М.Кірава аднавіў сваю працу ў складзе трох ранейшых факультэтаў. У структуры гістарычнага факультэта плённа працавалі кафедра гісторыі СССР і кафедра ўсеагульнай гісторыі. У 1955 г. гістфак быў пераведзены ў Магілёўскі педагагічны інстытут.

Гістарычны факультэт адрадзіўся ў складзе Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М.Машэрава ў 2001 г. і працаваў да лета 2020 г. За гэтыя гады выпусцілася больш за паўтары тысячы студэнтаў дзённай і завочнай форм навучання па такіх запатрабаваных спецыяльнасцях, як "Гісторыя", "Гісторыя і сацыяльна-палітычныя дысцыпліны", "Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны", "Музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры (культурная спадчына і турызм)", "Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (інфармацыйнае забеспячэнне)", "Тэалогія". За гады дзейнасці факультэта праведзены дзясяткі міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцый, апублікаваны сотні манаграфій і навуковых артыкулаў, студэнты і выкладчыкі ўдзельнічалі ў разнастайных выхаваўчых, валанцёрскіх, культурна-масавых і спартыўных мерапрыемствах.

З верасня 2020 г. выкладчыкі і студэнты гістарычнага факультэта сталі часткай факультэта гуманітарыстыкі і моўных камунікацый. У яго складзе працуе кафедра гісторыі і культурнай спадчыны, якая памнажае справу гістарычнага факультэта.

— Якімі якасцямі, на Ваш погляд, павінен валодаць сучасны гісторык?

— Ён павінен быць прафесіяналам і свята выконваць чатыры правілы.

**Першае правіла:** "шчыра служы сваёй Айчыне і сваёй дзяржаве". Наша Айчына вырасла з Русі, Рускай зямлі. Наша дзяржава, якой гісторык павінен служыць, — Рэспубліка Беларусь.

**Другое правіла** я бы назваў "правілам крата". Гісторыку-прафесіяналу трэба ўвесь час працаваць над сабой, павышаць свой прафесійны ўзровень, а прафесарска-выкладчыцкаму саставу з "гільдыі Кліа" варта ўвесь час "капаць архівы" ў пошуках гістарычнай праўды.

**Трэцяе правіла:** "мець халодны розум і неабыякавае сэрца". Гэтае правіла гісторык павінен выконваць увесь час, асабліва калі ён выносіць свой уласны "прысуд гісторыі", разважліва ацэньваючы гістарычныя факты і падзеі.

**Чацвёртае правіла,** якое свята павінен выконваць прафесійны гісторык, — гэта біблейская ісціна “Не забі!”. Гісторык не павінен заклікаць да гвалту і павінен пазбягаць гвалту сам, ведаючы, што ўся гісторыя чалавецтва — гэта бясконцыя войны і рэвалюцыі. Слова гісторыка ў любой аўдыторыі — як востры меч: яно можа не толькі ствараць, але і глыбока раніць. Таму трэба імкнуцца да стварэння.

І напрыканцы. Яшчэ старажытныя рымляне казалі, што “гісторыя — гэта настаўніца жыцця”. І сёння гэтае выслоўе гучыць актуальна і павучальна.



*Дэкан гістарычнага факультэта прафесар В.А.Космач са стажорамі з Пскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта і іх кіраўніком прафесарам А.В.Філімонавым.*

— Наколькі ў нашай краіне актуальны такі накірунак, як германістыка? Калі так, пералічыце, на Вашу думку, найбольш цікавыя яе этапы.

— Лічу, што германістыка вельмі актуальная па некалькіх прычынах. Па-першае, беларусы і немцы часта і шмат сустракаліся ў гісторыі адзін з адным пачынаючы з Сярэднявечча па прычыне цывілізацыйна-геапалітычных і транзітна-гандлёвых фактараў. Гэтыя кантакты былі далёка не заўсёды мірнымі, асабліва ў XX стагоддзі. Вывучыць усю багатую палітру ўзаемаадносін двух народаў і заклікана беларуская гістарычная германістыка.

Па-другое, абодва народы пастаянна выяўлялі ўзаемную цікавасць да гістарычнага мінулага і сучаснасці адзін аднаго па самым шырокім спектры тэм, пытанняў і праблем. Таму ў беларускай гістарыяграфіі і раней, і сёння германістыка займае асаблівае месца і з'яўляецца адным з папулярных навукова-даследчых напрамкаў у выкладанні і ў навукова-даследчай рабоце.

Па-трэцяе, з боку дзяржаўных структур, і не толькі, на гістарычную германістыку заўсёды быў попыт; яна мае прыкладное значэнне, напрыклад, для Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь, міністэрстваў і ведамстваў, якія займаюцца знешнім гандлем і знешняй культурнай палітыкай. Дапамагчы “заваяваць” больш сяброў і зменшыць колькасць нядобразычліўцаў для Беларусі — ключавая прыкладная місія беларускай германістыкі ў цэлым.

На мой погляд, у гісторыі беларускай гістарычнай германістыкі можна вылучыць тры перыяды. Першы можна пазначыць як яе зараджэнне і пачатак. Гэта 1921—1948 гады. Вывучэнне гісторыі Германіі Новага часу пачыналася ў БДУ (У.М.Перцаў, Е.І.Рыўлін, Я.С.Фейгельсон, В.А.Сербента, Л.М.Шнеерсон, Г.М.Трухноў).

У 1948 г. адбылася абарона кандыдацкай дысертацыі Г.М.Трухнова на тэму “Германская імперыялістычная палітыка на Балканах у перыяд першай Балканскай вайны 18 кастрычніка 1912 г. — 30 мая 1913 г.”.

Гэтая падзея паклала пачатак другому перыяду ў гісторыі беларускай гістарычнай германістыкі (1948 г. — пачатак 1990-х гг.). Яна аформілася ў самастойную навуковую школу, якую ўзначаліў Г.М.Трухноў (1908—1986). У 1964 г. ён абараніў доктарскую дысертацыю. Пад яго навуковым кіраўніцтвам больш за 20 гісторыкаў сталі кандыдатамі і дактарамі гістарычных навук, у тым ліку і мы з братам — Генадзем Аркадзьевічам (1953—2016), адным з аўтараў Канцэпцыі гістарычнай адукацыі ў сярэдняй



*Генадзь Космач.*

школе Беларусі. Работы беларускіх гісторыкаў-германістаў (В.М.Пісарава, Ю.Я.Івоніна, М.А.Бяспалай, М.В.Стральца, П.А.Шупляка і інш.) атрымалі шырокую вядомасць і прызнанне не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі.

Трэці перыяд — з 1990-х гг. і па сённяшні дзень. У гэты час працуюць новыя гісторыкі-германісты (А.Г.Субоцін, Н.В.Вялічка, С.П.Кізянкоў, У.В.Фральцоў, І.І.Кавяка, М.М.Мязга, Л.У.Гаўрылавец і інш.). Пачалі распрацоўвацца тэмы, якія датычацца Першай і Другой сусветных войнаў, баявых дзеянняў

на тэрыторыі Беларусі, акупацыйнага рэжыму і барацьбы беларускага народа супраць германскіх акупантаў, гісторыі беларускай палітычнай эміграцыі ў Германіі ў міжваенны перыяд, калабарацыі, партызанскага і падпольнага руху, пасляваенных рэпарацый, шырокага спектра беларуска-германскіх адносін.

Важнай падзеяй у гісторыі беларускай гістарычнай германістыкі стала ўтварэнне Беларуска-германскай камісіі гісторыкаў (БГКГ). Яе ўстаноўчы сход прайшоў 31 студзеня — 1 лютага 2020 г. у Берліне. Гэтай падзеі папярэднічалі дзве рабочыя сустрэчы ў форме сумесных навукова-практычных канферэнцый у Гісене (Германія, снежань 2018 г.) і Мінску (люты 2019 г.). На жаль, камісія апошнія два гады не працуе па віне германскага боку, які аказаўся занадта палітызаваным і заняў дэструктыўную пазіцыю ў працы БГКГ.



В.А.Космач са студэнтамі.

— Якімі Вы бачыце галоўныя задачы пры падрыхтоўцы спецыялістаў гуманітарнага профілю?

— Трэба больш актыўна працаваць у вышэйшай школе па рэалізацыі дзяржаўнай гістарычнай палітыкі. Неабходна мадэрнізаваць праграмы вучэбных дысцыплін па гістарычным профілі, весці працу па падрыхтоўцы новых падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, укараняць новыя тэхналогіі ў навучанні і выхаванні прафесіяналаў і патрыётаў сваёй краіны. І вядома ж, удзяляць максімум увагі магістратуры ў плане якасці выкладання і арганізацыі навукова-даследчай работы. Многае па ўсіх гэтых напрамках ужо зроблена, але работы сёння і на перспектыву яшчэ больш.

Лічу, што варта было б у навучальных планах усіх спецыяльнасцяў прадугледзець абавязковае напісанне курсавой работы па гісторыі сваёй малой Радзімы. Гэты крок, на маю думку, будзе садзейнічаць больш эфектыўнай і якаснай падрыхтоўцы і выхаванню спецыялістаў-прафесіяналаў і патрыётаў сваёй краіны.

В.А.Космач і загадчык кафедры гісторыі Беларусі А.М.Дулаў пад час анлайн-прафарыентацыі.



— Пад час нарады з членамі Рэспубліканскага савета рэктараў устаноў вышэйшай адукацыі ў лютым 2024 года Кіраўнік дзяржавы ставіў пытанне аб якасці навучальных праграм: ці своечасова іх абнаўляюць, ці ўкараняюцца навейшыя тэхналогіі ў навучанні. Што робіцца выкладчыкамі ўніверсітэта па іх вырашэнні?

— У Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П.М.Машэрава, дзе мне выпаў гонар працаваць доўгія гады на розных пасадах, абнаўленню вучэбных праграм і вучэбных планаў пастаянна ўдзяляецца першарадная ўвага кіраўніцтвам універсітэта, дэканамі і загадчыкамі кафедр, прафесарска-выкладчыцкім калектывам. Інакш і не можа быць. У адваротным выпадку, як кажуць, можна апынуцца на “ўзбочыне прагрэсу”.

Якаснае забеспячэнне адукацыйнага працэсу і выхаванне моладзі — гэта прыярытэты нашай працы. Задачы, пастаўленыя Кіраўніком дзяржавы, патрабуюць адказнасці і дысцыпліны ад кожнага з нас. Упэўнены, што мы выканаем усе даручэнні Прэзідэнта якасна і ў тэрмін.

***— Дзякуй, паважаны Веньямін Аркадзьевіч, за Вашыя шчырыя адказы! Жадаем плённай працы на карысць Кліа!***